Вольная Беларусь

Цэна асобнага № 25 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м	За 2 м	За 3 м	За 4 м	За 5 м	За 6 м	За 7 м	За 8 м	За 9 м
1 р.	2 р.	3 р.	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнага месяца.

Перамена адрэсу 50 кап. Пры зьмені адрэсу конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць.

На ліставанне, перасылку рукапісау і іншыя адказы—павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эконамічная і літэратурная.

ГОД ВЫДАННЯ I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18.

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы—1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 33 1917 г. Пятніца 8 сьнежня 1917 г. № 33

Багаты вы...

Багаты вы,
Мае паны,
Грашыма...
— Сваіма?
Дык бедны вы,
Мае паны,
У палацы...
— Да працы.
Багаты вы,
Мае паны,
Зямлею...
— Свяею?
Дык бедны вы,
Мае паны,
Работай
— Ахвотай..
Багаты вы,
Мае паны,
І сілай
— Змарнелай..
Дык бедны вы,
Мае паны,
Гадамі?
— Не!—днямі..

Багаты вы.
Мае паны,
Навукай?
— Не!—штукай!
Дык бедны вы,
Мае паны,
На розум
Цьвярозы.
Багаты вы,
Мае паны,
Хаценьмі...
— С-пад цемні..
Дык бедны вы,
Мае паны,
Паверце
— На сэрцо...
Багаты вы,
Мае паны,
Шмат чым..
— Чужым..
Багаты вы,
Мае паны,
Кругом...
— Больш злом!

А. Сумны.

Фэдэрацыя і конфэдэрацыя.

Фэдэрацыя і Конфэдэрацыя—гэта хаурус гасударствау ці народау. што звязаушыся у сунолку паміж сабой, ствараюць новае гасударство, карыстаючы аднакжа з большай ці меншай нізалежнасьці.

Фэдэрацыя патрэбна і карыстна усім народам і гасударствам.

Прыдзе час, калі усе гасударствы на сьвеці злучацца спярша у вольных фэдэрацыях, а посьля у адну вялікую усесьветную фэдэрацыю.

Навят у цяперашнім часі гасударствы ні могуць жыць зусім па-асобку і вось, вольні дзесятку таму назад, Нямеччына, Аустра-Вэнгры і Італія злучыліся у адзін хаурус «Трыедзіны Хаурус», а Расія, Францыя і Англія, у другі хаурус пад назвай «Трыедзіная Згода». У часі вайны да «Трыедзінага Хаурусу» далучыліся Турэччына і Балгарыя, а Італія вышла с хаурусу; а да «Трыедзінай Згоды» далучыліся: Бэльгія, Сэрбія, Чорнагорыя, Японія, Румынія, Партугалія, Італія і Амэрыка. Гасударствы, што ні ваююць (нэйтральныя) так сама, згаварыушыся, выступаюць хаурусна, як напрыклад: Скандынаускія (Швэцыя, Норвэгія і Данія). Такім чынам, уся Эуропа і нават увесь сьвет вайшоу у хаурусы. з якіх посьля вайны могуць паустаць фэдэрацыі і конфэдэрацыі.

Найболып патрэбна фэдэрацыя маленькім народам, а так-сама тым, якія толькі што скінулі чужую няволю і праз тое самае яшчэ ні пасьпелі узмацавацца. Такія народы павінны заусёды быць у страху, што больш дужыя суседзі захочуць выкарыстаць іх слабасьць і адабраць ад іх зямлю і волю. Яны змушаны моучкі пераносіць крыуды, прадаваць танна усе тое, што яны маюць, а у другіх купляць дорага усе патрэбнае для сябе; у выпадку вайны паміж дужымі суседзямі, малыя народы руйнуюцца німіласэрдна. Гэтак зруйнавалі у гэтую вайну Беларусь, Украіну, Сэрбію. Чорнагорыю і Бэльгію.

Толькі тады, калі малыя народы, злучыушыся у фэдэрацыі і конфэдэрацыі, зьяуляюцца вялікімі і моцнымі гасударствамі і ніякія ворагі ім ні страшныя. Найдужэйшая і найбагацейшая фэдэрацыя—гэта Злучаныя Штаты Пауночнай Амэрыкі. Яна складаецца з 47 гасударствау, ці штатау; кожнае такое гасударство ні больш за расійскую губэрню, а есьцека ні большыя і за павет. Усе штаты карыстаюць з роуных правоу і разам складаюць вялікае гасударство, у якім жыве больш за 100 мільенау людзей. Гэта фэдэрацыя такая моцная, што усе змушаны вельмі лічыцца з ею. Пауднёвая Амэрыка складаецца уся с фэдэрацыі (Аргэнтына, Бразылія, Вэнэцуэла і інш.) усе гэта маладыя фэдэрацыі, але яны с кожным годам багацеюць, узмацоваюцца і робяцца усе больш і больш культурнымі. Да таго часу. як яны зьедналіся у фэдэрацыі, яны былі і дзікія, і цемныя, і бедныя. Наймалодшая, але ужо слаўная фэдэрацыя. гэта Аустралія—ей толькі 15 гадоу. Яна паустала так сама, як і Злучаныя Штаты Амэрыкі, —з быушых ангельскіх калёній, што памалу зрабіліся нізалежнымі, а посьля злучыліся у фэдэрацыю. Аустралійская фэдэрацыя у супольцы с Канадай і іншымі быушымі ангельскімі калёніямі і разам з Англіей складаюцца яшчэ у адну вялікую фэдэрацыю—Брытанскую. Гэта самая свабоднае на сьвеці фэдэрацыя і праз тое самае завецца *конфэдэрацыей*. Для нас яна мае вялікую вартасьць дзеля таго, што Хаурус Народау Расіі трэба будзе будаваць так, як будавалася конфэдэрацыя Брытанская, а Беларусь, Украіну, Кауказ, Сыбір і др. трэба арганізаваць так як арганізавалася Аустралійская.

Усе гэтыя фэдэрацыі і конфэдэрацыі—нацыянальныя, ці, інакш кажучы, складаюцца с частак аднаго народу, адвэй нацыі.

Аднак жа-ж есьць і конфэдэрацыі, што злучаюць розныя народы, напрыклад, Швэйцарская конфэдэрацыя; яна складаецца з 22 кантонау (штатау, ці маленькіх краеу) францускіх, нямецкіх і італійскіх. Гэтая конфэдэрацыя—найстарэйшая на сьвеці фэдэрацыя (істнуе больш як 800 гадоу) і найсвабаднейшае гасударство у Эуропі.

Цікава, ці такі раздроб на нівяліччкія часткі ні шкодны часам?

Перш-на перш, фэдэрацыя гэта ні раздроб, а гуртаванне сіл. У фэдэрацыі тое, што трэба рабіць супольна, робіць супольны Фэдэратыуны Урад, а тое, што датычыцца толькі спрау кожнаго краю па асобку, пастанауляюць Урады гэтых краеу. Напрыклад, супольнае войско і стасункі з другімі гасударствамі датычуцца усіх краеу Хаурусу і імі кіруе агульна-фэдэратыуны Урад—у гэтым драбіцца было-б шкодным. Сваім чынам, запасная армія (запас і апалчэнне), почта, тэлеграф, грошы, унутрэнія тамэжні, чугунка, агульнае і грамадзянскае законадауство і інш. ні патрэбуюць такога абьеднання і дзеля таго усім гэтым справуюць Краевыя Урады згодна паміж сабой і з агульнафэдэратыуным Урадам. Возьмем яшчэ школьную справу, мейсцовае самаупрауленне, налогі, падаткі, зямельную справу, гандаль, промыслы—усе гэта мало датычыцца грамадзян іншых краеу фэдэрацыі і, дзеля таго, гэтымі справамі запрауляюць свае краевыя урады у кожным краю.

Цяперака наглядзімо, чым розніцца фэдэрацыя ад дэмакратычнай рэспублікі.

У папраудзі дэмократычнай рэспублікі усімі справамі кіруе сам народ, а калі рэспубліка складаецца з розных народау, ды ею кіруюць усе народы: усе народы пасылаюць порауну сваіх прэдстаунікау—у Цэнтральны урад, а гэта і будзе фэдэрацыя. Вось чаму папраудзі дэмакратычная рэспубліка, у склад каторай уходзюць розныя народы, можэ быць толькі дэмократычнай. Калі-б Расія ні была фэдэрацыей, ці, інакш кажучы, калі у ей Цэнтральны Урад будзе складацца ні с прэдстаунікау кожнаго з яе народау, выбраных гэтымі народамі, а с тых, за каторыя будуць мець перавагу галасоу у агульна-расійскім парлямэнці, дык гэта будзе урад ні дэмократычны. а і імпэрыялістычны, дзеля таго што перавага галасоу заусёды будзе у вялікарусау, якія толькі часамі, з ласкі, дапусьцяць да Ураду прэдстаунікоу іншых народау, ні вялікарусау.

Усе народы Расіі,—дэмократы і рэспубліканцы,—ні просюць ласкі, а хочуць па праву кіраваць усімі справамі у гасударстві. І вось чаму мы павінны будаваць фэдэрацыю, ці, інакш кажучы, праудзівую, а ні фальшывую дэмакратычную рэспубліку. Хто процу фэдэрацыі, то ні за дэмократызм, а за імпэрыялізм, той за панаванне адной нацыі над другой, ці за панаванне адных народау над другімі. Нам могуць сказаць, што сярод вялікарусау могуць быць людзі, якім можна верыць. Так, але яны могуць быць, а могуць і ні быць. Можа трапіцца і цар добры, але. дзеля таго, што німа пэунасьці, што посьля яго ні сядзе на трон таві, што будзе да нічога, або і вораг народу, дык мы і уважаемо манархію за найгоршую форму дзяржаунаго ладу. Гэтак сама і у гасударстві ні фэдэратыуным. Мы ні маемо пэунасьці, што, посьля добраго ураду, у міністры ні трапяць нашыя ворагі ды ні пачнуць нас ціснуць. Вось праз тое мы за фэдэрацыю, бо толькі яна забезпечыць нам пра во прычыненьня да Цэнтральнаго Ураду і аднача́сне дасьць нам для нашых нацыанальных спрау свой уласны урад, уласную Краевую Раду і уласныя законы пад апекай нашаго уласнаго войска.

Мы ужо досыць жылі пад панаваннем чужых урадау і добра ведаем, што чужы урад, нават і тады дрэнны, калі у склад яго уваходзяць рэвалюцыанэры і соцыялісты.

(Канец будзе).

А. Б.

Пара бараніцца.

Шалены віхор поустання разрастаецца і расшыраецца. Яго дзікае полымя абхоплівае сваімі буйнымі хвалямі усе большыя масы людзей. Пайшоу буяніць і разгуліваць зьвер. Той зьвер, каторы у звычайным часі сядзіць глыбока захаваны у чэлавеччай душы, а у часі смут і сваволля зрываецца з ланцугоу сумлення, сораму і страху.

Рабуюць і палюць маенткі, мястэчкі і вескі. Абдзіраюць адзін другога. Рэжуць, бьюць, нішчуць здабыткі людзкія і—ратунку німа.

Гэты шалены віхор разгулівае цяпер у нашым краю. Гурт дзікіх людзей-ваукоу, уходзючы ад фронту, рыскае па нашай зямлі і нішчыць, глуміць усе на пуці сваім, астауляючы за сабою плач, стогны, голад, холад і руіны.

Што далей будзе, што нас чакае пад вясну, посьля гэтых рабункау,—страшна падумаць. Голад давядзе людзей да таго, што брат па брата пойдзе, сын на бацьку рынецца, у літэрным значэнні гэтых слоу.

Нібы цемная лавіна атруты, гэта пугачоушчына шырэй і шырэй абхоплівае наш абездолены край і прэтварае яго у адны попялішчы.

Чужынцы абгрызуць нас. А як ужо тут нічога ні астанецца, чым пажывіцца, пойдуць адгэтуль кожны да сваей хаты, далека ад фронту, у свой ціхі, спакойны і цеплы кут. А мы астанемся без нічога.

Як змагацца з гэтым? Як ратаваць свае дабро, здабытае дзесяткамі гадоу крывавай працы?

Ад расійскай уласьці чэкаць ратунку німа чаго. Як тыя лялячкі бэтлеячныя, паказываецца яна з адных дзьвярэй і выходзіць праз другія, і разнакалерныя фігуркі, што хвіліну, меняюцца і нічым памагчы ні могуць. Як тыя госьці да хворай цеткі, прыходзюць яны, наківаюць галавамі у знак свайго безсілля і... выходзюць.

А шалены віхор бушуе, разгульвае вольна, нахальна, і разводзіць свае гідасьці направа і налева.

Браты, беларусы! ні ад кога мы дапамогі чэкаць ні можам, а толькі *самі* павінны сябе бараніць—бараніць сваіх дзяцей і старых ад галоднай сьмерці, ад пэунай разрухі.

Мы самі за сябе павінны стаяць! Дык вось дзеля гэтаго самаго Беларуская Вайсковая Рада у Мінску арганізуе беларускае войско, формірує беларускія полкі, каб абараніць свой край, сваіх бацькоў і дзяцей, свае дабро.

Воіны беларусы, змучаныя, абездоленыя за увесь час вялікай вайны! На вас ляжыць вялікі абавязак, самы законны і сапраўдлівы абавязак кожнаго чэлавека—бараніць самаго сябе.

Каб вы мелі да каго і да чаго вернуцца посьля вайны, каб цемныя сілы ні зруйнавалі да шчэнту вашу бацькаўшчыну-Беларусь, запісывайцеся цяперака у Беларускае войско!

Дзе б вы ні былі, на усіх фронтах, вымагайця, каб вас формíравалі у адзельныя часьці і напраўлялі у свой край да родных межау. — Бараніце сябе ад бесстыдных, цемных людзей-зьвяроў!

Гэтыя подлыя трусы-скоты пабаяцца аднаго вашаго зьвулення, і вам ні прыдзіцца ужываць сілы

Запісывайцеся у Беларускае войско і бараніце свой родны край ад загібелі!.

З. Бядуля.

Цікавасьць ды годзі!

Палякі «тутэйшаго родзаю» ні у жарты завінаюцца каля умацавання «стану пасядання». Аб гэтым можна даведацца амаль ні штодня з «Дзенніка Мінскаго», с таго самаго «Дзенніка»,каторы запэўнуе беларускае грамадзянство, што мейсцовыя палякі разумеюць, дзе «пасядаюць» што яны кінуць брыдкую звычку спакушаць нісьвядомых людзей на рэнегацтво і зраду і хочуць згодна, у поплеч з нашым грамадзянствам, працоваць і змагацца за аўтаномны лад у нашым, агульна нам родным, краю. Але, мабыць, трудна пазбыцца тых звычак, што папоўвалі векамі. І вось даведваемся, што «мястэчко Бялынічы (Магілёўск. губ.), якое даўней слыло цудоўным абразом Маткі Божае, праз апошнія годы жыло сонным жыццем, і жменька каталікоў, ні маючы зносін с шырэйшым сьветам, ведала столькі аб Польшчы, што умела гаварыць папольску пацеры [Трэба прыслухацца лепій,—ці па-польску гэта? Рэд.]. Школа польская, адчыненая у маі, так заохвоціла народ да прасьветы, што с пачатку школьнаго году прышлося адчыніць другую... Есьць бацькі, якія прывозяць дзяцей за 15 вёрст і трымаюць іх на кватэры, абы толькі дзеці *вучыліся на роднай мові*. (На дыялекту «Д. М.» гэта называецца пісаць, а па-нашаму—нясьці маскаля. Рэд.). Як моцна патрэбна была польская школа (беларус, родная мова, польская школа—разумейце языцы!Рэд.), як моцна патрэбна была польская школа, сьведчыць факт, што шмат навазапісаных дзяцей ні толькі ні умея, але нават ні разумея па-польску (Ось табе маеш! Рэд.). Гэта есьць звычайная рэч на Беларусі, дзе людзі саўсім забыліся аб сваём праміўлым [о, не,—ні забыліся, ягомасьць! Рэд.].»

Трэба-ж канец-концам умовіцца раз назаўсёды, што Беларусь есьць Беларусь, а Польшча—Польшча. Годзі гуляць у жмуркі!

Трэба нарэсьці, называць рэчы іх уласным найменням і абвесьціць, што тыя дабрадзеі, што будуюць у нас школы дзеля абраблення цёмнаго нісьвядомаго селянства на палякоў,—есьць падшуканцы і прыслужнікі імперыялізму, ад якіх сапраўдныя палякі с агідаю адхіснуцца, як ад ганебнай заразы. Трэба сказаць голасна і ні зважаючы на абразу,—гэтых панаў абразіць ні магчыма,—трэба сказаць аб іх праўду: палякоў на Беларусі німа, або іх у нас столькі, сколькі на Маскоўшчыні; большая частка тых, хто называе сябе у нас палякамі,—здраднікі і рэнегаты каторым ні павінна быць мейсца сярод пачэснаго грамадзянства; гэта людзі, каторыя страцілі усё сьвятое і гатовы самога Бога іЯго сьвятую справедлівасьць ужыць дзеля сваіх махлярскіх, зрадніцкіх заданняў. Сапраўдныя палякі нас зразумеюць,—яны пераджыўшыя маскоўскае іго, знаюць па чом хунт ліха! А тыя, хто на Беларусі цяўпоча пра Польшчу або Маскоўшчыну, нас ні палохаюць. Яны толькі назаляюць нам, як назаляе муха, прыстаўшая сьляпіца пад час гарачае працы!

„Антось Лата“

(„Сцэнічныя творы“ Тараса Гушчы).

Шмат каму даводзілося чуць, як скардзіліся беларусы-артысты з вялікіх расійскіх сцэнаў, што яны ахвотне-б прапрацовалі для беларускае справы, пашыраючы беларускую сцэну і граючы беларускія пьесы, каб сцэнічная літэратура наша здавольняла запатрэбованне іх «артыстычнаго стажу». На жаль, трэба прызнацца, што скарга іх мела падставу. Да гэтаго часу у беларускай літэратуры ні было сталых сцэнічных твораў. Тое, што было, насіло характар шаблоннасьці, а анэкдотычны зьмест іх перашкаджаў ні толькі іх пашырэнню, а нават таму, каб яны зьявіліся у друку. І толькі з выйсьцям у сьвет сцэнічных твораў нашаго найвялікшаго пісьменніка у прозі, Тараса Гушчы, гэты прабел у нашай сцэнічнай літэратуры папоўніўся, і сцэнічная літэратура наша можа вытрымаць самыя густоўныя запатрэбованні.

«Сцэнічныя творы» складаюцца з двух рэчаў: «Антось Лата»—сцэнічны твор на два акты, і «На дарозі жыцця»—пьеса на адну дзею.

«Антось Лата» напісан дапраўды мастацкі і выхвачан с самае гушчы селянскаго быту. Аўтар так жыва і вобразно малюе сваіх простых, ніхітрых герояў, што яны становяцца у ваччу, як жывыя. Яны гаворапь, жартуюць, сьпеваюць, сьмяюцца і—здаецца, што ні ў кніжцы гэта чытаеш, а бачыш жывых, сапраўдных людзей. Такую ужо сілу мае талянт!

Карчма—звычайны мястэчковы патайны у ціперашні час шынок. Двое селян, Габрусь і Рыгор, выпіваюць у карчмі і скардзяцца на сябе і на сваё цёмнае жыццё, пацешаючы сябе прысьпеўкамі. Каб уцячы ад свайго жыцця, яны гатовы зараз-жа паехаць да Амэрыкі, дзе увесь народ панаваты, працаваць ні любіць, а таму заработкаў там, колькі хочаш,—«лапатаю агрэбай дзенюшкі». Стары шынкар заўважвае, што покі яны заедуць у Амэрыку, то да «рыгі» напэўня трапяць. Так яны пьюць, сьпеваюць ды жартуюць то с шынкаром, то с шынкаркаю.

Зьяўляецца постаць Антося Латы—горкаго прапойцы. Праз пьянство ён увагнаў жонку ў дамавіну, пакінулі дзеці яго, і застаўся ён адзін у сваёй, патыхаючай пустэляй, хаці. Ен разумея, што гэта гарэлка згубіла яго і гэтае адчуванне згубы свае яшчэ горш штоухае яго па тэй сьцежцы, с каторай сыйсьці ён ні можа. «Губляў я гарэлку многа раз»,—кажа ён: «але яна ні прападала, а гарэлка згубіла мяне адзін раз, і я ні знайду сябе». Думка аб згубі сваёй ні дае яму супакою. Нават саўсім апьянелы, ён ані на момант ні можа забыцца аб гэтым. Ен зайдросьціць усім, хто лепшы за яго, зайдросьціць жыду-карчмару, што можа сядзець над бібляю. «Эх, Бэрка, Бэрка! Сьвятым хочаш быць, законы талмудаў спаўняеш, а Антосю шпількі запускаіш. Ну, што-ж?!» Ды адабраўшы біблію, шпурляе яе во-б зямлю, а схамянуўшыся, перапрошае: «Выбачай, Бэрка,—я ні са злосьці—натура мая такая... Эх, каб, я быў пісьменны! Напісаў-бы пра нашае жыцце ды *як* напісаў-бы: сьлязьмі і кроўю!»

Думка пра горкую, пьяную долю сваю агнём паліць сэрцо яго. Як гвозд засела тая думка у голаў яго і ні дае яму тхнуць. А людзі... людзі сьмяюцца, дзеці на вуліцах пальцамі тыцкаюць. Німа, нікагутка німа, хто-б усьцешыў ласкаю і добраю радаю, даў супакой змучанаму сэрцу яго. Адзін, адзінюткі, як той крыж сярод поля.

Канчаецца тым, што на дарозі с карчмы, у ночы, сярод лесу, яго хворы, зьверадованы розум уяўляе зданні—Пьянство і Цьвярозасьць, каторыя прыйшлі на суд да яго. Сцэна з зданнямі набірае вялікай трагічнасьці. Толькі чытаючы, ні кажучы ужо пра сцэну, аж шкура шорхне ад жахоцця. Свае хваравітыя спрэч-

Шчасьлівы той...

Шчасьлівы той,
Каму здаецца,
Што з доляй злой
Ен размінецца. .
Што шчасьця мець
Хвіліну будзе,
Што будзе пець,
Што зло забудзе...
Шчасьлівы той,
Каму надзея,
Хаця парой
У далі ясне—
І за сабой
Яго вядзе...
Шчасьлівы той
Хто верыць—йдзе...

Пасьля загіве
І расплывецца, —
Ен у магіліне
Ужо апынецца,
Праляцеўшы век
Ахвяр цярпення—
Адвечны зьзяек
Пад шчасьця цеьмі...
І ні зазнаўшы
Тых мук распачы;
Хто усе згубіўшы
Ужо й ні плача...
Бо і ні можа:
Згубіў надзею...
Авалица—«Божа!»
Нават ні сьмея...

Шчасьлівы ен,
Шчасьліў—шчасьлівы,
Хоць нават сон
Жыцця фальшывы

Шчасьлівы той
Каму здаецца,
Што з доляй злой
Ен размінецца!..

А. Сумны.

Чарнічка.

Над пахмураю, мокраю зямлею павісло шэра-цемнае, нуднае, восенняе небо.

Пустая вуліца маучыць. Людзі, калі у-дварэ, дык сідзяць па хатах. І коні у пуні, бо у полі земля замерзла, і толькі седні троху адтаяла і пакрылася зьверху ліпкаю гразькаю. А у лажчынах шчэ бялеіцца па лагу і блізка лесу беленькі, рэдкі сьнегавы налет. Смутна гудзіць абголены гай на узгорку. У нізахістанай а ні сувалкаю, а ні чым на зіму, пуні плятневай мычыць карова.

Ні багаты фарбамі тутэйшыя малюнкі! Саусім бедно гукамі паветро глыбокай восені у глухой весцы.

На вуліцы—груда, ліпкая зьверху у пагодлівы дзень. Пуста. Нікога. Рэдка гдзе пад паудзень пракандыбаіць стары дзед з рэзьвінамі да старога гуменца. Накінуушы палусьвітак, шпарка прабяжыць журавінка-дзеука да таварышкі з вышываннем пад палою.

Вот і усе.

На рагу, лі канцавога двара, прывязан за аброць к баньцы у шулі, запрэжаны у «бяду» на двух колах, ціхі і спакойны гняды конь. Ен апусьціу галаву, зьвесіу вушы і ні есьць. Жмуток балотнага сена сіротліва разсыпаіцца перад ім па ветру. На «бядзе», на пажоуклай. сухой гарохвіні нейкі мех, запэцканая, закачаная торба, аржавая асока гнядому каню.

У нівяліčкае, з мутнымі шыбамі вакенцо, часта заглядаіць с хаты на свайго коніка чорная маладуха-манашка.

З ей ішчэ адна. З беднаго манастыра паехалі зьбіраць восенную радзіцельскую каляду.

У гэтай хаці яны папрасілі абедаць. Разагрэліся.

Старэйшая утупіла вочы у стол і ні падніmaіць іх с-пад чорнай наміткі. Слабенькая ружовая краска рэдзенька выступіла меціnкамі і жылкамі на шчоках там, гдзе ягадкі. Ложку за ложкай нясець яна паціху варыва і падстауляіць кусанік акуратне, каб ні было капак па сталу.

Маладзейшая сьмялей. Расчырванелася за ядою. С-пад зьмятай, зьлінялай намітачкі выбілася чорная жменька сукрысьціньkіх валасоу. Вусты пухлы і чырвоны. Зьняцейку яна саромліва ускініць часам чорныя бліскучыя вочы на маладога мальца, і у іх пачынаюць хавацца дзявоцкія агоньчыкі.

Ох, дзеука! Ні манашкаю стварыу цябе Бог; сядзець ба табе у мешчанскай хатцы, у гарадзкой слабадзе і раджаць здаровых і важкіх дзяцей с пухлымі вустычкамі і сукрысьцінькамі валосікамі...

У хаці старых німа; разыйшліся. Толькі маліц на лауцы ды залоука яго на запечку корміць дзіценка, ні саромліва, с правом маткі, разгарнуушы цьмяна—белыя грудзі.

— «Як ен пільна угледаіцца на мяне, мірскі чалавек! То ж на запечку, ма' быць, ні сестра яго, а жонка»,—думаіцца маладэй манашцы.

А хлапец спахваля скруціу папіроску і пачау агонь выкрэсаць, і ні можна было зразумець, ці сьмеяуся ен, сьмех хаваючы, ці думау аб чым, ці так марудна рыхтавауся гутарку пачаць.

— «Насьміхаіцца... Аднак, які прыгожы і ладны; дарма, што мужык»,— і у вакно зірнула, ці стаіць конь.

Стаяу, як заснуу, гняды конь; пуста і хмарна было на вуліцы; вецер клычыу жмуток балотнаго сена. І трэба было згадзіцца, што восень на дварэ, а нейкае нівыразнае ніздаваленне варушылося на сэрцы і чаго-сьці сярод восеннаго смутку жадалося.

— Ні бойся: на нашай вуліцы усе дабро цэло будзіць... Гэта пра вашых амсціслаускіх кажуць: знаім мы вас,—начэвалі—сякера прапала. А у нас людзі дабрачынныя. Чаго такая пужлівая?—пачау хлапец.

— Каб ноды конь ні адвязауся. Зьбяжыць, тады што нам?—сказала маладая чарнічка.

А старэйшая ніпрыкметна тауханула яе пад сталом, гаварыць забараняючы, і зьмірэнна, як псальму пяючы, атвесьціла:

— Нам жа грэх вялікі прад Госпадам Богам будзіць, калі увядом каго у пакусу дабром сваім, што падарувалі людзі добрыя на манастыр Яго.

— Нічога... адвяжыцца, у нас пажывіце пакуль што,—пажартувау с тэй хлапец.

Ніжэй схілілася старэйшая манашка, а маладая усьміхнулася нісьмела і прыгожа, як нісьмел і прыгож пачатак чыстаго кахання.

— А я цябе... не, не, маладзейшую... відзіу цябе, як на Тройцу у манастыр Богу маліцца хадзіу. Прыгожа там у вас у весну. Ліпы прыгожыя, цэрква прыгожая і пяюць дужа прыгожа.

— Відзіу? Трудна, здаецца, прыкмеціць. Паслушніц у нас даволі, і усе мы адна да дной падобны у сваем адзенні.

— Не,—праўда, відзіу.

— І я ужо дзівілася,—казала з запечку залоука,— і я на Троіцу з ім хадзіла туды. Колька ж там у вас маладзенечкіх, прыгожых, і ужо адракліся на усе жыццийка ад суяты нашай. Ча' йта ужо так ідуць? Ці сіротак туды бяруць гадаваць змалку, ці-то, кажуць, іншая з-за хлеба, з-за спакою ідзець у манашкі.

— У нас ні павінна быць такіх—адказала старэйшая, у нас маці-ігуменя стродка жыціе блюдзець.

— Ха, праўда што;—засьмеяуся хлапец,—ехау я нешта раз да гораду міма вашых лялеу. А чарнічкі пшаніцу палолі. С-пад узгорачку ні відаць, ці едзіць, ці ідзець хто. І-і, як жа яны там песьні пелі, а тады, знаць, борыцца пачалі.

— Што ты, што ты, чалавечэ! У нас за працаю псальмы пяюць,—усхапілася старэйшая і троху памаучала.— А хлапцам усе так. Яны й на богамаленство прыдуць—грэху нанясуць. У цэркві ні молюцца, а, а...

— А на чарнічак загледаюцца,—дакончыу ен.

Пачырванела, як мак добры, маладзенькая. Змоукла тая. Кончылі сьнедаць. Доуга кстіліся і кланяліся перад абразамі, а потым дзякавалі і укланяліся залоуцы і з нейкай перашкодай яму.

І у маладой, пад стродкасьцю і сьвятой безклапотнасьцю, усе мітусілося нешта і кірувалося выскачыць, ды ні паказацца, такое ці чым-то падобнае, як у тэй Джыаконды.

А хлапец пачувау сябе легка і вясела. Бачыу і чуццем чуу тое, што было, там на сэрцы, у маладэй чарнічкі. І шкода яе было, смутна. Адылі неяк люба. І спрыяу ей, ні-бы роднай і ладнай сястрыцы.

...Пустэльны восенны шлях. Поле безлюднае. Зелянеіць рунь. Едкі вецер налетае с-пад голаго, як слово, рэдкаго цяпер лесу. Марудна і спакойна цягніць гняды конь «бяду» па калюгах глыбокіх. Як машынная цацка, з боку на бок ківаіцца чарніца на скачучай «бядзе», калі то тое, то другое коло, па чароду, то праваліцца у калюгу, то выскачыць на груду. Чырванеіць край неба—мароз дэкляруіць. Чый то лен, на логу пасьцелены, унік у дол—час паднімаць яго, сушыць, церці, бавючы дні у доугія Пілінаукі. Далека шчэ Каляды. Як нудна. Маучыць на вазу старэйшая чарнічка с чырвоным птушыным носам; ківаіцца і глыбей хаваіць рукі у шырокія рукавы. Мусі, задумалася пра жыцце свае, і што скажыць ігуменя пра дарогу. Шчупянецца і пачынаіць варушыць тонкімі губамі, механічна і заучона шэпчучы словы малітвы.

А маладзейшая легка ідзець побач тых калюг на зьмерзай калянай мурауцы. Прыціхла, нібы засмуцілася. Аб чым яна думаіць? Часам апошняя бліскавічка радаснай усьмешкі прабяжыць па пухлых мешчанскіх вустах і узноу, ішчэ глыбей, захаваіцца пад наўмысьнай стродкасьцю і сьвятой безклапотнасьцю. Нешта вінавата—нівіннае.

І думае: «Больш мяне па каляду ні пашлюць»...

М. Горэцкі.

1915 г. Багацькаука.

5-го сьнежня г. г. у Мінскім Гарадзкім тэатры пачауся усебеларускі з'езд. Першага дня адбылася парада дэлегатау.

кі з зданнямі ён канчае так, зьвярнуўшыся да Пьянства: «Ты забрала маё сэрцо,наліваючы вантробы мае гэтаю атрутаю. Чуеш ты?!.. Будзь ты проклята! На вечныя векі праклінаю цябе, чортава служка! У апошні мой час прыйшлі вы насьміхацца з міне. Вам мала насьмешак над цэлым маім жыццём». (Як пружына кідаецца на здань і падае на дол мёртвым).

«На дарозі жыцця»—пекны, прыгожа напісаны абразок пра Беларусь, каторая шукае раскіданых па сьвеці дзяцей сваіх. Дзеці пакінулі яе, і нават тыя, якіх выпадкова знаходзіць яна, адрэкаюцца ад яе,—старой, беднай, у парванай вопратцы. Сцэна канчаецца тым, што Беларусь, у постаці старой кабеціны, кленчыць перад прыдарожным крыжу ды моліцца, каб Бог дапамог ёй сабраць дзетак сваіх. «Божэ, расьпяты на крыжы! Зьнімі з мяне цяжкі крыж мой і пакажы мне дарогу у сэрцо маіх дзетак!»

Язэп Лёсік.

ПА БЕЛАРУСІ.

Мінск-Беларускі. 28-га лістападу закончыліся выбары да Устаноўчаго Сойму па гораду Мінску. Усяго падано галасоў 35651. Па асобку за кожны зьпісак галасовало:

№ 1	(с.-с. і е.-с.)	278
№ 2	(жыдоўскі блок)	12624
№ 3	(земляўласьн.)	55
№ 5	(менш. і «Бунд.»)	2881
№ 6	(к.-д)	2154
№ 8	(польскі)	4261
№ 9	(большэвікі)	9521
№ 10	(поалей-ціон)	1461
№ 11	(расійцы)	1278
№ 12	(с.-р.)	977
№ 13	(беларуск. с.-грам.)	161

Сьпіскаў за № 4 і № 7 ні было; яны былі выкасованы, як ніправідловыя. Абсэнтэізм па гораду Мінску быў натта вялікі. Да выбароў прычынілося ўсяго 40% маючых права падаваць голас, або у два разы менш, як пры выбарах да гарадзкой думы. З 9-і выбарных вучастках па Мінскаму павету на першым мейсцы ідуць «большэвікі,» на другім—с.-р., а потым польскі нацыянальны блок.

Па г. Бабруйску большасьць голасоў адтрымаў жыдоўскі сьпісак—4000 гол., на другім мейсцы «большэвікі»—2300 гол., потым «меншэвікі»—2100 гол. Агулам бяручы, на выбары прышло 40% выбаршчыкоў.

Урочыстае пасядзэнне Мінскай Горад. Думы. 28-го лістопаду у горадзкім тэатру адбылося урочыстае пасядзэнне Горадзкой Думы с прычыны адчынення Устаноўчаго Сойму у Петраградзі. Выступленне большэвікоў выклікало гучныя протэсты. Ухвалено дзень 23-го лістападу лічыць усенародным сьвятам. На 3-е сьнежня была назначана маніфэстацыя, на каторую заклікаліся усе партыі і арганізацыі.

У прамовах прамоўцы называлі Устаноўчы Сойм у Петраградзі гаспадаром Расійскай Рэспублікі, каторому павінна належыць уся уласьць у дзяржаві.

Аблога. 30-го лістападу прыказам за № 1 большэвікі абвесьцілі г. Мінск у аблозі (военное положеніе). Хадзіць па вуліцах посьля адзінастае гадзіны забаронено. У горад маняцца пускаць толькі тых, хто адтрымае падсьведчэнне ад ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў і, паміж іншым, ад Ваенн. Беларускай Рады

Стрэляніна. 29-го лістападу у Мінску каля 8-й гадзіны у вечар натоўп салдатаў, даведаўшыся, што на ст. Александроўск.ж.д.прышлі цыстэрны с спірытусам, кінуўся на іх, каб разгроміць і расхватаць спірытус. Іх запынілі. Пачалася стрэляніна, падчас каторай аднаго чалавека паранілі.

с. Старыца, Слуцкаго павету. Нам прыслалі гэтакі прыгавор: «Мы, грамадзяне беларусы с. Старыцы, Пукаўскай вол., Слуцкаго павету, зышоўшыся на агульны сход 15-го лістападу 1917 г., выслухалі даклад прапоршчыка Калпака аб зьездзі воінаў-беларусаў Заходняго фронту у г. Мінску 18-24-го кастрычніка гэтаго году. Абмяркаваўшы гэтую справу міжсабою, аднагалосна ухвалілі гэтакую пастанову: 1] прасіць Вялікую Беларускую Раду скарэй арганізаваць беларускае войско, каб бараніць сваю нізалежнасьць; 2] дзяцей у школцы вучыць на беларуску і 3] Беларусь павінна увайсьці аўтаномнай часткаю у Расійскую фэдэратыўную Рэспубліку.

На нацыянальны беларускі фонд ахвяравалі 33 рб. 64 кап.; просім пасылаць газэту «Вольная Беларусь.»

Грамадзяне Русакоў і Бадзежы, Пукаўскае воласьці далучаюцца да пастановы Старычан. На нацыянальны беларускі фонд шлюць 8 рб. 60 к., а на 21 рб. 67 кап. просяць пасылаць газэту «Вольная Беларусь» для кожнай вёскі асобна.» [Рэдакцыя адтрымала на газэту 6 рб.]

Г. Нясьвіж, Слуцкаго павету. Вучні настаўніцкай сэмінарыі выпусьцілі гэтакую адозву: «Да вучняў беларусаў. Гляньце, ужо сонцо падымаецца! Людзі устаюць, да працы ідуць.

Таварышы! Усе, каму дораг родны край, хто любіць свой народ і хоча працаваць дзеля яго шчасьця, павінны глыбока праняцца тэй ідэяй, што толькі падняцце нацыянальнаго самаусьведамлення народа падыме яго культуру, закліча яго да гістарычнаго жыцця і паставіць на роўную ногу з другімі народамі. Ціпер, калі вораг разарваў наш край на дзьве часткі, калі да Беларусі працягваюць рукі ворагі нашы, кажучы: «гэта нашае,»—мы павінны цьвёрда стаць і сказаць: «Годзі зьдзекавацца над намі, мы хочам самі гаспадарыць у сваёй хаці!»

А каб наша праца была на карысьць народу, нам самым трэба быць к гэтаму гатовымі. Мы заклікаем вас закладаць пры школах гурткі «Беларускае Т-во Прасьвета» і прысылаць нам аб гэтым весткі, каб посьля маглі склікаць зьезд прэдстаўнікоў гэтых арганізацый. «Беларускае Т-во Прасьвета пры Нясьвіжскай Вучыцельскай Сэмінарыі.»

Статут гуртка: А.) Беларускае Т-во Прасьвета сваею мэтаю ставіць: 1] нацыянальнае самаусьведамленне вучняў усяго беларускаго народу; 2] злучэнне вучняў беларусаў у адну арганізацыю дзеля падняцця інтарэса да знаёмства з жыццям Беларусі і яе культурай і дзеля карысьнейшае працы сярод беларускаго селянства; 3] развіцце роднае мовы і пашырэнне беларускай літэратуры; 4] пашырэнне нацыянальнай сьвядомасьці сярод беларускаго вучыцяльства; 5] чытанне дакладаў, рэфэратаў на сабраннях гуртка па нацыянальнай справі; 6] пастаноўкі па сцэні беларускіх тэатральных твароў; 7] згодная праца с тымі беларускімі арганізацыямі, якія стаяць на чале беларускаго нацыянальнаго адраджэння, і барацьба с тымі, якія хочуць задушыць нацыянальны рух народу і пакінуць яго у цемнаце на старой дарозі; 9] зьбіранне сябрукамі гуртка беларускіх народных твораў.

Б. 1] Беларускае Т-во Прасьвета ёсьць арганізацыя культурна-прасьветная; 2] сябруком гуртка можа быць кожны, хоць і ні вучань, калі ён прымае статут гуртка; 3] членскі уклад—50 кап. у месяц і 1 рб. пры запісу у гурток; 4] працаю гуртка кіруе прэзыдыум с 5-і чалавек: (старшыня, яго таварыш, два пісары і скарбнік), выбраны на агульным сходзі сябрукоў гуртка; 5] сход лічыцца правамоцным, калі зьбярэцца 2/3 яго сябрукоў. Статут зацьверджан на агульным сходзі. Старшыня—А. Бандацкі, яго таварыш—П. Хвашчынскі, пісар—М. Міцкевіч.

Вітэбшчына. У Вітэбшчыні у фронтавым районі ужо паелі усе запасы, пададбіралі жывёлу і разбурылі гаспадаркі. Цяпер віхор руйнавання бушуе і шырыцца па губэрні. Пачынаюць з маёнткаў і даходзюць да хутароў. У Гарадокскім павеці асталіся покуль што цэлымі два маёнткі. Дзіка нішчуцца нацыянальныя скарбы. Што німа як унясьці або увезьці, то нішчыцца на мейсцы; такім чынам, астаўляюць на мейсцы парэзаную жывёлу. Абразы, цяжкія шафы, камоды і др. палюцца на вогнішчах. Раскідываюць печы, падлогу і стол. Часам усе будоўлі падпаліваюцца. Здаралося, што забівалі гаспадароў, калі тыя ні пасьпелі уцечы. Лес глуміцца да канца. Гэтыя дзікія расправы ужо пачаліся і у Вітэбскім павеці і німа каму бараніць.

ХРОНІКА.

◁ Адтрыманы весткі ад дэлегатаў Камітэту Беларуск. Войск. Рады с паўднев.-заходн. і румынскаго фронтаў, што фронтавыя зьезды воінаў-беларусаў склікаюцца на румынскім фронці с 1—6-го сьнежня, а на паўдн-заходным а 10—20-го сьнежня.

◁ У Маскве пачалася арганізацыя беларусаў-міліцыянераў; адрэс арганізатора—Гороховая вул., Москоўскі горад, газавы завод. І. Ф. Кеда.

◁ У Маскве прыступлено да арганізацыі беларусаў-тэлеграфістаў-тэхнікаў Адрэс арганізатароў: 1 Знаменскі, д. № 10, кв. 11, Бернацкі, Рыбак і Шуляковскі.

◁ У Маскве мае адбыцца агульны арганізацыйны сход беларусаў-студэнтаў г. Масквы.

◁ У Таганрозі пачалася арганізацыя сярод рабочых-беларусаў Балтыйскаго судабудовальнаго заводу і іншых фабрык і заводаў. Часовы адрэс арганізатора Ф. І. Ігнатовіча—Александр. вул. 11-й перавул., дом № 1.

◁ У Ніжне-Днепроўску, Екатарынослаўск. губ. арганізованы беларусы рабочыя глаўных майстарняў Екатарын. ж. д.

◁ У Шуі і Іванава-Вознесенску пачалі арганізавацца беларусы-рабочыя тутэйшых фабрычна-заводзскіх районаў.

◁ Балтыйскі флот. Арганізацыя матросаў-беларусаў пачалася тут яшчэ у июні месяцы. Цяпер моцна арганізовано больш за 800 матросаў, звязаныя агульным жаданнем пастаяць за родную Беларусь.

◁ У Гельсінфорсі арганізацыя беларусаў-воінаў энэргічно зьбірае ахвяры на карысьць уцякачоў і на арганізацыю беларусаў; частку грошай ужо прыслалі Выканаўчаму Камітэту Вялікае Рады для Цэнтр. Беларускаго Бежэнскаго Камітэту.

◁ Вялікая Беларуская Рада пастановіла зьвярнуцца праз свайго камісара па справам народнае прасьветы, Тарашкевіча, да належных установаў з запатрэбованнем, каб у настаўніцкіх інстытутах, сэмінарыях і іншых педагогічных вучэльнях, гатуючых настаўнікаў для Беларусі, выкладалася гісторыя, географія Беларусі, беларуская мова па старасьвецкім актам, беларускія народныя песьні па зборнікам Шэйна, Чэчота і др. і каб вучні знаёміліся з беларускімі поэтамі: Марцінкевічам, Багушэвічам, Паўловічам, Якубам Коласам, Янкам Купалам, Богдановічам, А. Гарунам і іншымі.

◁ 19-21-го лістопаду у Маскве адбыўся другі беларускі зьезд. Як і на першы зьезд, прыехалі больш уцякачы. Ухвалілі: 1) Беларусы павінны мець нацыянальна-тэрыторыяльную аўтаномію у межах этнаграфічных граніц беларускаго народу: 2) аўтаномная Беларусь павінна уваходзіць у склад будучай Расійскай фэдэратыўнай рэспублікі; 3) Беларусь павінна складаць самабытную дэмакратычную рэспубліку і мець зараз-жа свой законадаўча-адміністратыўны орган; 4) Вялікая Беларуская Рада на першай сваёй сэсіі павінна абвесьціць Беларусь Дэмакратычнай Рэспублікай, а сябе часовым урадам і упраўляць Беларускай Рэспублікай да склікання Беларускаго Устаноўчаго Сойму, і т. д.

▭ Беларускі Областны Камітэт пры усерасійскай Радзі селянскіх дэпутатаў выпусьціў дэкляроцыю, у каторай заклікае усіх беларусаў паўстаць на абарону свае бацькаўшчыны і домагацца аўтаномнай Беларусі у межах фэдэратыўнай Расійскай Рэспублікі.

▭ 26-го лістападу у Маскве адбыўся першы сход беларусаў-воінаў, на каторым, выслухаўшы даклад аб рабоці зьезду і Вайсковай Рады, быў выдзелен, так званы, ініцыатыўны гурток беларусаў-воінаў Москоўскае ваенное акругі, у склад каторого увайшло 10 чалавек. Часовы адрэс гуртка: «Масква, Тверская, 53. Рада Селянскіх Дэпутатаў, трэці этаж.

Беларуская Рэспубліка. 5-го сьнежня склікаецца у Мінску беларускі зьезд разам с прэдстаўнікамі вайсковых частак. На зьездзі мае быць абвешчана Беларуская Дэмакратычная Рэспубліка, у склад якой увойдуць: Віленшчына, Міншчына, Магілеўшчына, Вітэбшчына, Гродзеншчына, заходнія паветы Смоленшчыны і паўночныя паветы Чарнігаўшчыны. Рэспубліка мае увайсьці у склад агульнай фэдэрацыі с правам нацыянальна-персанальнай аўтономіі іншых народаў новае Рэспублікі. Гадаюць, што на зьездзі мае быць абвешчана безплатная перадача зямлі народу; стварыць нацыянальную армію, выбраць краёвую Раду і дамагацца свайго прэдстаўніцтва на мірнум конгрэсі.

ЧЫННАЯ АРМІЯ.

▭ **XII армія.** У тутэйшых войсках беларусы пачалі арганізавацца яшчэ ад ліпня месяца. Яшчэ 20 ліпня арганізаваўся Часовы Выканаўчы Камітэт. У пасядзэнні 1-го лістападу было ухвалено: 1) зараз-жа арганізаваць войско у тылу і на фронці; 2) прызнаць, што Расія павінна быць толькі фэдэратыўнай дэмакратычнай рэспублікай; 3) арганізаваныя беларусы XII арміі, у тым выпадку, калі ім будуць перашкаджаць, дабьюцца сваіх дамаганняў усімі заходамі, нават і рэвалюцыйным поўстаннем. Маюць на мэці увайсьці у цесны блок з усімі нацыянальнасьцямі. Ухвалено вымагаць перадачы ўсей ўласьці на Беларусі самому беларускаму народу і адміністратыўныя пасады даручыць тым асобам, якія прытрымліваюцца палітычнай пляцформы Вялікай Беларускай Рады.

9-я артылерыйская брыгада. На пасядзэнні слухалі даклад таварышоў Свішчэўскаго і Турцова, каторыя вярнуліся з Мінску ад Вялікай Беларускай Рады, і апаведалі аб нацыянальным беларускім руху. Так-само чыталі ухвалы вайсковаго зьезду. Выслухаўшы даклад і ухвалы, мы, прэдстаўнікі Беларусоў 9-й артыл. брыгады, прылучаемся ахвотна да ухвалаў зьезду і абецаемся памагчы у сьвятой працы на колькі можна.

Мы шчыра вітаем нашу Вялікую Вайсковую Беларускую Раду. Усе свае сілы, усё сваё жыцце мы аддамо за сваю нацыянальную волю. Мы у кожную хвіліну гатовы падтрымліваць свой найвышэйшы і аўтарытэтнейшы рэволюцыйны орган нават узброенай сілаю.

Ніхай на векі жыве шырокая тэрыторыяльная аўтаномія Беларусі у Расійскай фэдэратыўнай дэмократычнай Рэспубліцы.

Слава Вольнай Беларусі!
Слава Вялікай Беларускай Радзі!

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Справа украінскай цэркві. На Украіні утворан камітэт па склікашню усеукраінскаго цэркоўнаго сабору духавенства і міран. Цяпер ідзе падгатоўчая праца каля абрання прэдстаўнікоў на Сабор, перакладаюцца на украінскую мову цэркоўныя кнігі і праводзіцца праца каля адраджэння украінскае цэркоўнае традыцыі. У скорым часі будзе выдана адозва да украінскаго народу на конта склікання сабору. Сабор думаюць склікаць 23-го сьнежня (декабра).

Пры Генэральным Сэкрэтарыяці думаюць утварыць аддзел вераіспаведных спраў. Пытанне пра адлучэнне цэркві ад дзяржавы пэўня будзе вырашацца або на цэркоўным саборы Украіны, або на Украінскай Устан. Радзі.

Украінскае войско. У Кіеві адтрыманы весткі, што с Петраграду і Масквы украінскае войско рушыло ужо на Украіну. С петраградскіх і іншых полкаў вылучэно каля 9.000 воінаў-украінцаў, каторыя едуць з мноствам самострэлаў і броневікоў. Адна частка прыехала ужо с Петраграду, і заве сябе палком імяні Орліка.

Адносіны Францыі да Украіны. Праз апошні час у Францыі павялічваецца цікавасьць да Украіны. Тут гадаюць, што калі у будучыні Украіна стане нізалежнаю, то саюзнікі залічаць сваім абавязкам захінуць яе ад ваеннаго і эканамічнаго завоевання цэнтральных дзяржаваў.

Проф. Масарык пра сучасныя падзеі. 16-го лістападу адбыўся вальны сход таварыства эконамістаў, на яком разглядалі пытанне пра эконамічныя адносіны Чэхіі і Расіі. Да бяседы прычыніўся так само і прафэсар Масарык, старшыня Чэшска-Словацкай Нар. Рады, каторы на су-

часныя падзеі у Расіі выславіў такі свой погляд:

«Нэмцы завуць Чэхію пэрлінаю Аўстра-Вэнгрыі. Гэта праўда. У эконамічным адношэнні ні толькі што датычыцца сельскаго гаспадарства, але й у фабрычнай прамысловасьці—наш край так само віська раскві̇чаны, як і Гэрманія. Гэты роскві̇т у пэўнай мэры выклікала нашая нацыянальная бароцьба з немцамі. Калі я пачынаю роўняць Чэхію з Расіяю і хочу свой дасьлед формуліроваць навучна то я бачу вось якую розьніцу: мы—так званы малы народ [хоць сапраўды мы належымо да народаў сярэдніх,бо нашае мейсцо ў Эўропі—сёмае], рускія—вялікі. Усё нашае жыццё—інтэнсіўнае, тагды як у вас усё нараспашку. экстэнсіўна,—усё жыццё, усё чыста. Я гэта бачу па вашай вайне, па таму, як вы ваюеце, як вы дбаеце пра сваіх салдатаў—усё гэта экстэнсіўна. Тое самае я бачу і у вашай эконамічнай рабоці і у культурным жыццю. І разумеяцца, рускаму народу гэтак само давядзецца інтэнсіцыраваць сваё жыццё, ні толькі сваю экономіку. Цяпер я у вас усё бачу і чытаю пра фэдэрацыі, аўтаноміі; Расія, здаецца, распадаецца на асобныя столкі, на асобныя рэспублікі. У гэтым я бачу нахіл да інтэнсіфікацыі. Ваш стары рэж..м быў ні толькі абсалютычны, але так само і цэнтралістычны. А на цэнтралістычны лад кіраваць адною шостаю зямной галкі (шар)—гэта проста німагчыма.

Заява Троцкаго. Говарачы пра палітыку рады народных камісараў, Троцкі падкрэсьліў, што падчас м'рных перагавораў большэвіцкія дыплёматы маюць на увазі ні столькі цэльнасьць расійскае тэрыторыі, сколькі тое, каб збыліся сусьветныя соцыяльныя заданні.

Пра тэрор Троцкі сказаў, што ні трэба забываць «што у Францыі падчас рэвалюцыі працовала спеціяльная машына, якая кароціла чалавека роўна на адну голаў.»

Карнілоў уцёк. Быўшы вярхоўны глаўнакамандуючы уцёк з Быхоўскаго вастрогу на Магілёўшчыні, дзе ён трымаўся да часу поўстання. З вастрогу яго аслабонілі па падробляным дакумэнтам. Вызваліўшыся на волю, Карнілаў стаў на чале чэчэнцаў, прылучыў да сябе яшчэ колькі салдат ды пешкі пайшоў на Жлобін, а адтул па залезнай дарозі на Сумы і Харкаў.

Ліст.

Сцішна вецяр павевае,
Чуць-чуць гай калыша.
Мае сэрцо заныває—
Чаму ен ні піша?
«Ой ніужо ен на чужыні
На мяне забыуся?
Ой, ніужо ен мяне кінуу
І з другой зьлюбіуся?»
Ніхай вецяр загалосіць
Ад самога рання,—
Сэрцо мае шчасьця просіць,
А душа—кахання.
Пойду,сяду,--пісаць стану:
«Дарагі мой, мілы!
Ты ні пішыш, а я вяну,
Гінуць мае сілы...»

Ні пасьпела я пачаці—
Шась--пісьмо мілога:
Я пазнала па печаці...
Напісау німнога.
«Ензабіт:»--пісьмо гавора.
Далей усе сьцямнело...
Дзе падзену свае горо?
Сэрцайко самлело..
Салавейка пеу вясною,
Пеу ен пад нібасьце,—
Я любіла, я кахала
Ды ні мела шчасьця.
Як пад восень дуб у полі
Свае лісьці роніць,
Я згубіла сваю долю.
Плачу я ды плачу...

Якім Сявец.

Уселякія весткі.

Выміранне „дзяцей Амура“.

Нілюдзкая эксплуатацыя сібірскіх інородцаў прыводзіць іх да вымірання. Гэта—гілякі, гольды, орочы і іншыя «дзеці Амура», агуловая лічба каторых дасягала у гэтым краю да 12.000 чалавек.

Юрыдычна гэтыя народы—поўнапраўныя грамадзяне расійскай дзяржавы, але на практыцы у іх ёсьць начальнік Арсеньеў. Апрач таго, яшчэ ні скасован закон, па катораму грошавы гандаль с кожным с гэтых народаў ні мае права быць большым, як на 3 руб. Калі гіляк ці гольд вам вінен і ні плаціць, то па закону вы маеце права зыскаць з яго толькі тры рублі. Але гэта па суду,—зноў такі юрыдычна, а на практыцы з яго можна злупіць колькі хочаш пропэнтаў. Можна зрабіць яго вечным даннікам. І робяць. Такое становішчо прывело інародцаў да голаду, і людзі вымірають.

Ідэалёгія цяперашняе вайны.

Проф. Масарык апублікаваў кнігу пад назваю «Ідэалёгія цяперашняй сусьветнай вайны». Кніга гэта зрабіла вялікае уражэнне у З.-Эўропі.

Цяперашняя вайна зьяўляецца сусьветнай у літаральным значэнні гэтага слова, бо у гэтую вайну замешан увесь сьвет. Пачалася яна з выступлення Аўстра-Вэнгрыі процiў Сэрбіі; да апошняга часу яна згуртавала амаль ні усе народы процiў Гэрманіі; мільёны людзей забіто, на цэлыя міллярды зьнішчано усялякага дабра—якi-ж сэнс усяго гэтага? Сэнс вайны—арганізацыя Эўропы і сьвету. Дзеля гэтага выстаўляны праграмы: гэрманская праграма сусьветнага уладарства Прусаў і праграма антыгэрманскай коаліцыі праўнай арганізацыі Эўропы на аснові самаазначэння народаў; праграма гэрманцаў—ярка імпэрыялістычнага характару, праграма саюзьнікаў—дэмакратычная.

У сучаснай вайне найбольш пякучымі сталі нацыянальныя пытанні у цэнтральнай эўропэйскай поласе, дзе малыя і сярэднія народы, або іх часткі падупалі пад уласьць Гэрманіі і Аўстра-Вэнгрыі. 23 мільёны немцаў і мадьяраў трымаюць пад сваім ігам 30 мільёнаў славянаў і романцаў. Аўстра-Вэнгрыя—гэта арганізованае гвалтоўніцтво меньшасьці над большасьцю, гэта тып сярэдняве-коваго гасударства, якое павінно згінуць, як згінула Турцыя.

Без гэтаго перабудавання цэнтральнае Эўропы у разуменні вызвалення і абьеднання асобных частак польскаго, украінскаго, румынскаго, італійскаго народаў ні мажліў моцны і трывалы мір.

У канцы кнігі проф. Масарык упамянуў аб другіх тлумачэннях сучаснай вайны і падкрэсьліў, што яны усе абмінаюць пытанне аб вінавайцах у гэтай вайне, і заклікае усіх на работу у гэтым агромністым гістарычным процэсі, каб ён прынёс спакутнаму чалавецтву доўгачаканы трывалы мір, пабудованы на праўнай арганізацыі народаў Эўропы і усяго чалавецтва.

Новапоўстаўшае Літоўскае гасударство.

Газэта польскай партыі соцыялістваў «Glos robotnika i żolnierza», разьбіраючы справу утварэння праз немцаў нізалежнаго Літоўскаго гасударства, піша, што акт гэты, як відаць з усяго, мае тымчасовы характар, і што лёс Літвы вырашыцца толькі пасьля вайны. Літва, якой падарована ужо Краёвая Рада, ні уяўляе с сябе ні этнографічнай, ні гістарычнай Літвы і ні складаецца с тых губэрняў, якія называліся у Расіі «літоўскімі»і цяпер акупованы немцамі.

Немцы проста узялі кавалак зямлі з рознымі народамі—этнографічна літоўскую землю, чысто польскую частку Сувалшчыны, польска-беларускую (польскую?) Віленшчыны разам з горадам Вільняй, у якой літоўцаў толькі жменька, ды, кіруючыся сваімі асобістымі палітычнымі мяркаваннямі, злажылі усё гэтае у адно і назвалі Літоўскім панствам. Утрымацца гэтакая рэч можа толькі штучна, бо сілы злучнасьці паміж аддзельнымі часткамі німа ніякай. Напрыклад, ужо і цяпер беларускі «Гоман», ні зважаючы на свой папоўрадовы характар, становўча засьцярог немцаў проціў раздзелу забранаго імі беларускаго абшару на дзьве часткі, адна з якіх прылучана да новапаўстаўшаго Літоўскаго гасударства, а другая застаецца яшчэ у ваеннай аблозі.

Зазначыўшы, што палякі так само павінны протэставаць проціў перашкод, якія чыняцца польскаму народу раздзелам пры утварэнні цяперашняй Літвы,газэта зауважвае, што, апрач блізарукіх літоўскіх нацыяналістаў, ніхто с тубыльцаў новым панствам ні здаволіцца.

Мендэлэ Мохэр-Сфорым.

25-го лістападу памёр у Одэсі адзін з старэйшых жыдоўскіх пісьменнікаў, маючы ад роду 82 годы, Мендэлэ Мохэр-Сфорым (Ш. Абрамовіч).

М. Мохэр-Сфорым радзіўся у 1835 г. у м. Капылі, Мінскай губ.

Першыя свае творы Мендэлэ пісаў па гэбрайску. У 1863 гаду вышоў у сьвет першы твор Мендэлэ на жыдоўскай мові (на жаргоні) «Клейн меншэлэ» (маленькі чалавек).

С таго часу за усё сваё жыцце ён пісаў ужо толькі па-жыдоўску і заваеваў сабе мейсца патрыярха-клясыка у жыдоўскай літэратуры. Быўшы прарокам праўды для свайго народу, ён ні баяўся кідаць яму у вочы яго хібы, малюючы цёмнае жыццё жыдоўскаго гэтто мінулаго сталецця.

Мендэлэ напісаў шмат аповеданняў, раманаў і драматычных твораў. Па свайму гумору Мендэлэ падобен да Гоголя. Яго так і завуць жыдоўскім Гоголем.

Ва усіх яго творах красуецца жывая ціха-сумная природа Беларусі, дзе ён радзіўся і вырос.

Новая рэспубліка.

Востраў Нардэн, каторы належыць да рэвельскай фартэчнай акругі абвесьціў сябе рэспублікай, апрацаваў канстытуцыю ды выпусьціў свае грошы. Утворан кабінэт міністраў. Міністр асьветы—фэльдшар, працы—качагар, фінансаў—цесляр. Інжанэры, якія кіравалі работай на востраві, арэштованы і вывезены у Кроншат. Калі міністрам Нардэна тлумачылі, што без інжанэраў німа як далей працаваць—міністр фінансаў сказаў, што адукацыя адна ніпатрэбшчына, бо ён, напрыклад, і падпісацца ні здоляе, а даслужыўся да міністра.

Мікалай Романоў.

Кажуць, што цэнтр. вык. камітэт рады р. і с. дэпутатаў пастанавіў перавесьці с Табольска быўшаго цара Мікалая II у Петраград, а потым у Кронштад. Дзеля гэтаго у Табольск паслалі чырвонагвардыйцаў і матросаў. Пастанову аб пераводзі Мікалая трымаюць у глыбокім сэкрэці.

Бурцаў а большэвіках.

Бурцаву запропановалі выпусьціць яго с фортэцыі, калі ён згодзіцца прыпыніць цкаванне большэвікоў. Бурцаў катэгарычна адмовіўся ад гэтай умовы і прасіў сваіх таварышаў перадаць за граніцу яго думку, што сучасная ўласьць у Расіі—у руках авантурыстаў. Калі б ён быў на волі, то выкрыў бы дзяржаўную здраду многіх цяперашніх кіраўнікоў. Бурцаў прасіў перадаць, што сучасны галава рады камісараў і яго супрацоўнікі—проста нямецкія агэнты.

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавецтво «Т-во Беларускай Культуры.»

Друкарня Я. А. Грынблата.